**УДК 39**

# КУРГАНЫ, ГАРАДЗІШЧЫ, СКАРБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ МІФАПАЭТЫЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

***Д. А. МАЛЧАНАВА***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*У народных уяўленнях скарб увасабляе незлічонае багацце, якое дастаецца чалавеку праз неверагодны шанцунак ці з дапамогай звышнатуральных сіл. У беларускім фальклоры скарб найчасцей прадстаўлены золатам. Народныя легенды і паданні часта звязваюць скарбы з археалагічнымі помнікамі (курганамі, гарадзішчамі) і з "чужынцамі" (татары, шведы, французы, літоўцы), якія схавалі свае багацці ў часе "даўняй" вайны.*

***Ключавыя словы**: курганы, звычайныя скарбы, заклятыя скарбы, гарадзішчы, асілкі.*

Скарб – каштоўныя рэчы, схаваныя ў тайніку: грошы, упрыгожванні, каштоўная зброя, посуд і інш. Скарбы падраздзяляюцца на эканамічныя і сакральныя, або ахвярныя. Абедзве катэгорыі скарбаў сустракаюцца ўжо з эпохі бронзы. Згодна з народнымі перакананнямі, скарбы могуць быць звычайныя (даступныя кожнаму чалавеку) і заклятыя, зачараваныя (ухаванне іх суправаджалася магічнымі заклёнамі, веданне якіх і дазваляла іншаму чалавеку завалодаць скарбамі). Як меркавалі ў народзе, над заклятымі скарбамі ўвесь час гарыць свечка, падымаецца дым ці чутны стрэлы. Скарбы маглі закопваць у склепе, у падпеччы, у гаспадарчых пабудовах,у калодзежах, на ўзвышшах, у курганах, на могілках, пад дрэвам (у тых месцах, дакуль цень сягае), у балоце (зямля, дзе быў закапаны скарб, магла быць ператворана менавіта ў балота, каб ніхто не змог да яго дакапацца). Чым бліжэй падбіраўся чалавек да заклятага скарба, тым глыбей ён уваходзіў у зямлю. Колькі год скарбы былі заклятыя, праз столькі год ён мусіў выйсці на паверхню, і калі хто не трапіць на каштоўнасці ў гэты час, скарб зноў на столькі ж год сыдзе ў зямлю [6. с, 468].*"Заклятыя скарбы ў буйнай фантазіі народа набываюць даволі дзіўныя формы. Поўныя катлы і скрыні грошай, што спрадвеку ляжалі ў зямлі, калі выходзяць на свет, маюць уласцівасць змяняцца ў чалавечыя, а таксама ў звярыныя постаці з чыстага золата. "Грошы заклятыя ўсяляк паказываюцца: агнём, катом, сабакаю, дзіцём, авечкаю, казою, усялякімі рэчамі…" [*2. с, 103].

У беларускім фальклоры сустракаюцца апавяданні такога тыпу, дзе прадстаўнікі сацыяльнай эліты – князі, княгіні, паны, генералы, якія не мелі нашчадкаў, перад сваёй смерцю хавалі ці праклінаі свае багацце. "Аб ім расказваюць, нібы ў незапомныя часы там стаяў церам нейкай багатай княгіні, але, паміраючы і не маючы нашчадкаў, гэта княгіня пракляла і церам і ўсё сваё багацце. З цягам часу гэты церам зруйнаваўся, і на тым месцы засталася толькі вялікая гара. Кажуць, што адзін чалавек, ведаючы, што тут адбылося, хацеў было пакарыстацца скарбам; знайшоў грошы і набраў, як занесці, але ў той самы час, калі ён хацеў пайсці з набытай казной, аслеп і не трапіў на сваю дарогу, хоць яна была тут жа каля яго. Тады ён зразумеў, у чым справа, паклаў казну на ранейшае месца і тады, зноў пачаўшы бачыць, пайшоў дадому" [4. с, 406].

У народных паданнях, скарбы таксама звязваюць з асілкамі, якія жылі ў часы першастварэння. У XIX ст. адносна гарадзішча ля в. Шнітніцы, на беразе возера Задрачая (Дубакрайская вол.) існавала паданне, што ў ім жыў волат. У 1840 гадах пры раскопках, тут знаходзілі розныя рэчы: сярэбраныя лыжкі і грошы, завушніцы і чыгунныя ядра [3. с, 12].

На тэрыторыі Беларусі пра закапаныя скарбы ў курганах бытуе шмат паданняў. У фальклорнай інтэрпрэтацыі золата можа належыць розным этнічным групам, а менавіта "французам", "шведам", "татарам", "літоўцам" – усе залежыць ад лакальных варыянтаў гісторыі Для насельніцтва Падзвіння і Цэнтральнай Беларусі, дзе ваенныя падзеі 1812 г. неслі жорсткі характар, аб'ектам даволі хуткай фальклярызацыі стала войска Напалеона [5. с, 444]. Менавіта для гэтых рэгіёнаў у найбольшай ступені характэрныя паданні пра "золата Напалеона", "Напалеонаўскія скарбы", якія былі зарыты салдатамі Вялікай арміі.*"Ай, гэтыя французскія магілы, сто раз іх правяралі. Во тут, за Буём. Ну, як нейкія ж французы пабітыя тут былі, пабітыя. Французскія. Гэта расказвалі… Там нейкая ж куча гэтага, ссуваная каменю, капаліся там, казалі, там французамі золата пахаванае, не нашлі там нічога"*, (Докшыцкі р-н)*; "Старая смаленская дарога шла ад Сушы і да Ульскай шашы. Па гэтай дарозе адступаў Напалеон. Ён захараняў у валатоўках скарб. Дзецьмі мы находзілі скалкі з камня, разнацветныя – галубыя, палоскамі, камні с ладошку і меншыя. Дык вот када Напалеон адступаў праз валатоўкі… Напалеон не ўспяваў вывазіць дабро. З места, дзе ён закапаў дабро, павінна было відаць сем азёр. Места этае недалёка ад Загорцаў"* (г. Лепель); *"І яшчэ вот. Не дахадзя Навіння… там называюцца Залатыя горы. Вот тожа легенда – Залатыя горы. Там пагоркі небальшыя, да нет, можа з хату не будзець. Там ёсць пагорак адзін, а чаму ён Залаты называецца… Залатыя горы. Там нескалькі пагоркаў. Гаворадь, што там закапана французамі золата"* (Полацкі р-н) [8. с, 267, 247].

У структуры лакальнага культурнага ландшафту менавіта курганныя пахаванні з'яўляліся прыярытэтным месцам для пошуку скарбаў "вясковымі археолагамі" усёй Беларусі. "Заклятыя скарбы (грошы) бываюць у розных месцах, асабліва ў курганах". Прычын такой "выбарачнасці" некалькі, і ў іх аснове ляжаць як аб'ектыўныя, так і міфапаэтычныя фактары ўспрыняцця рэчаіснасці. Як скарбы, так і курганы трывала суадносяцца ў традыцыйным светапоглядзе са сферай "чужога". І ў выпадку з курганнымі насыпамі іх прыналежнасць да тагасвету фіксуецца на ўзроўні семантычнай канстанты, а не знака, сімволіка якога абумоўлена сітуацыйным кантэкстам" [7. с, 20].

Паданні пра "залатую карэту" Напалеона бытуюць амаль у кожным рэгіёне, дзе ў свой час праходзіла (адступала) французская армія. Наратывы такога роду фіксуюцца ў Барысаўскім, Вілейскім, Глыбоцкім, Докшыцкім, Полацкім, Расонскім, Сенненскім, Ушацкім ды іншых раёнах Беларусь. *"Вот тожа легенда - Залатыя горы. Там пагоркі небальшыя, да нет, можа з хату не будзець. Там ёсьць пагорак адзін, а чаму ён залаты называецца... Залатыя горы. Там нескалькі пагоркаў. Гавораць, што там закапана французамі золата"( Полацкі р-н)* [5. с, 459].

Таксама са скарбамі звязваюць і гарадзішчы. "*Аднаго разу нас, дзяўчат, сабралася, мо, з пяць, і пайшлі мы па ягады. Ідзем па захадзе слонка з ягадаў, аж на Гарадышчы агонь зачаў гарэць. Мы думалі, што гэта хлопцы, падбягаем туды, ажно ж агонь усё – бух, бух, бух, а нідзе нічога няма. Так мы гэта ў крык да ўцёкі. А мы, па праўдзе сказаўшы, дурныя былі, бо гэта скарб перасушваўся. Каб на цяперашні розум, то кінула б што кароткага і былі б грошы, а так..."* [4. с, 411- 412].

Акрамя французскай арміі ў фальклорнай памяці беларусаў скарбы суадносяць і са шведамі. *"А во Шведава гара! Шведамі яна насыпана. Када ішла вайна, ішоў швед, і кажды, гаварацъ, ну шлём, па шапцы насыпалі – і гару насыпалі. Тут убіты глаўны іхны. І ён умураваны сярод гары гэтай. І тут жа дзе-то ёсць і вароты. Дзверы, да. Ёсць. Але ніхто не знаіць. Дзверы на васток. Тут какая-та пасловіца дзедава: бочку золата (дастанеш), еслі на бычку, на трэцячку з'едзеш у Вільна за тры часы, і прыедзеш. Золата тады"* (Докшыцкі р-н) [8 с, 250], *"За паўвярсты ад вёскі Таракані Кобрынскага павета знаходзяцца старыя могілкі, на якіх у вялікую суботу штогод з'яўляюцца вогненныя язычкі ад змяркання да поўначы. Гэтыя язычкі ўвесь час змяняюць свой колер і бываюць то белымі, то чырвонымі, то сінімі. Гэта ёсць не што іншае, як закапаныя тут шведамі грошы, якія перасушваюцца па закляццю ў вялікую суботу. Скарыстаць грошы не цяжка: варта толькі, не шануючы памяці пахаваных тут, ускапаць могілкі і раскідаць косці"* [4.с,413].

На Віцебска-Пскоўскім памежжы сустракаюцца паданні пра скарбы, схаваныя "літвой" у часе даўняй вайны. Так, пра гарадзішча Шэрая гара ля в. Колесава Невельскага павета. захавалася паданне пра тое, што яна "насыпанная літоўскім войскам, а ў яе сярэдзіне знаходзіцца склеп, у якім захоўваюцца зброя і грошы" [7. с, 16].

Валоданне скарбам, было важнае не толькі для жывых, але не ў меншай ступені - для мёртвых. Вера ў замагільнае жыццё вымагала ад чалавека пэўных высілкаў дзеля таго, каб яго прыжыццёвая доля мела адпаведную рэалізацыю і на "тым" свеце (звычай вылучаць долю нябожчыка ў выглядзе рэчаў, збожжа і грошай захаваўся ў традыцыйнай пахавальнай абраднасці праваслаўных беларусаў да гэтага часу. Зразумела, што "дабро" (грошы, каштоўнасці), нажытае пры жыцці, мусіла гарантаваць нябожчыку не толькі адпаведны дабрабыт, але і належны статус у свеце памерлых. "У сярэднявечнай Ірландыі былі распаўсюджаны апавяданні пра "жывых нябожчыкаў", якія пільна сцераглі схаваныя ў курганах скарбы - відаць, скарбы гэтыя былі патрэбныя ім не менш, чым жывым" [7. с, 19].

Паданні пра нябожчыкаў, якія сцерагуць свае скарбы, вядомыя і ў беларускай фальклорнай традыцыі. Ці не першай згадкай такога роду стала па-мастацку пераказанае Янам Баршчэўскім у 1840-х гг. паданне пра спробу адшукаць скарб у валатоўцы (кургане): *"Рыдлёўкі скрабуць па жалезе. - Чыгун! Чыгун з грашыма! - закрычалі ўсе з вялікай радасцю... Аж раптам маланка асвятліла пагорак, бачаць: стаіць Волат (у арыгінале - olbrzym, велікан. – У. Л.) у жалезным панцыры, трымаючы агнёвы меч над іх галовамі..: - Нікчэмныя людзі! Золату і срэбру прадалі вы свае душы. Думаючы пра багацце, вы зняважылі прах Героя, які слаўна скончыў тут сваё жыццё. Прыйдзе час падняцца з магіл мёртвым, і вы будзеце зганьбаваныя перад усім светам"* [7. с, 19].

Прыкметай скарбаў лічацца сінія або жоўтыя агеньчыкі, якія зіхацяць уначы на валах гарадзішча. Калі хто з людзей пабачыць тако едзіва, то адразу кідаецца шукаць скарб, але дарма [1 . с, 204].*"Заклятыя скарбы (грошы) бываюць у розных месцах, асабліва ў курганах. Уночы грошы гараць: золата- чырвоным агнём, а срэбра блакітным. З'яўляюцца яны таксама ў выглядзе людзей, жывёлаў і розных рэчаў. Ахвочы завалодаць такім скарбам чалавек павінен нечым кінуць у бок агню, які (калі кінуць знятым з адной нагі абуткам) ператворыцца ў кучу манет. Калі хтосьці недасведчаны ці няўважлівы кіне пояс альбо шапку, то агонь знікне, і грошы будуць на глыбіні паловы ці ўсяго чалавечага росту. Кожны багацей або скнара, чуючы блізкую смерць, закопваючы грошы, заклінае іх назаўсёды ці на пэўны час. Першыя паказваюцца людзям штогод, пераважна ў купальскую ноч, другія - як пройдзе той тэрмін, на які яны былі заклятыя. Калі агонь ніхто не пабачыць ці скарб будзе захаваны няўмела, ён вяртаецца ў глыбіню зноў на такі самы час"* [2. с, 105].

Можна прыйсці да высновы, што фальклорныя сюжэты, звязаныя са скарбамі, вельмі разнастайныя. Скарбы ў народным уяўленням дзеляцца на звычайныя і заклятыя. Скарбы, як і курганы трывала суадносяцца ў традыцыйным светапоглядзе са сферай “чужога”. Заклятыя скарбы ўяўляюцца ў розных формах гэта можна быць і скрыні грошы, і катлы, і гэтак далей. У народным уяўленні, валоданне скарбам важна не толькі для жывых, але і для мёртвых. Прыкметай, па якой можна знайсці скарб з’яўляюцца сінія, жоўтыя, ці красныя агеньчыкі. Скарбы могуць аб’яўляцца ў выглядзе жывёл (кот, сабака, авечка, каза), чалавека, або розных рэчаў. У традыцыйнай карціне свету беларусаў скарбы, якія былі схаваныя ў “даўнюю” вайну, рэпрэзентуюць сферу чужога, бо ўхавальнікамі скарба, паводле народных перакананняў, з’яўляюцца “чужынцы” (французы, шведы, татары, літоўцы).

ЛІТАРАТУРА

1. Дучыц Л. Сакральная геаграфія Беларусі / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск: Літаратура і Мастацтва. – 2011. –349 с.
2. Жыцця адвечны лад : Беларускія народныя прыкметы і павер’і / укл., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.
3. Известия Императорской Археологической Комиссии. Вып.5 / СПб.: Типография Главного Управления уделов, 1903. –132 с.
4. Легенды і паданні / склад. : М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі ; рэд. тома А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
5. Лобач, У. А. Міф. Прастора. Чалавек : традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. –511 с.
6. Лобач, У. Асташы / У. Лобач // Міфалогія беларусаў: энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2004. – 580 с.
7. Лобач, У.А. Курганы, гарадзішчы, скарбы: «вясковая археалогія» на тэрыторыі Віцебшчыны ў XIX–XX стст. // Беларускі фальклор : матэрыялы і даследаванні : зборнік навуковых прац.–Вып. 4. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – С. 10-39.
8. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. –Вып. 2. Ч.1: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. Ч. 1. –Наваполацк : ПДУ. –2011. –290 с.